ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, САЮЗАЙЦЕСЬ!

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 45 (427) Серада, 20 красавіка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дня. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тел. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

Аб экскурсыі ў Ленінград.

У сённяшнім нумары газэты на апошняй старонцы зьмешчан сьпіс прозьвішчаў тых таварышоў, якія залічаны ў склад экскурсыі „Ленінград-Краштат-Волхаўбуд.

Рэдакцыя газ. „Чырв. Зьм."

Лена--Шанхай.

Зараз у далёкім Кітаі міжнародныя драпежнікі, якія выкачваюць з поту і крыві кітайскага народу залатыя барышы,—сваёю рукою і рукою буйных кітайскіх капіталістых растрэльваюць рабочых у Нанкіне і Шанхаі.

Некалькі дзён таму назад працоўныя Савецкага Саюзу адзначалі 15-цігодзьдзе ленскіх растрэлаў.

У 1912 годзе у далёкай Сібіры, на раце Лене, ангельскія капіталістыя—уласьнікі залатых прыскаў сумесна з сваімі расійскімі кампаньёнамі рукою царскай жандармэрыі растрэлялі расійскіх рабочых.

15 год таму назад на Лене расійскі рабочы быў таксама бясправен, як сучасны кітайскі кулі. Ён працаваў у жудасных умовах, на жабрацкай узнагароде, жыў у холадзе, голадзе, гразі...

Даведзеныя да роспачы ленскія рабочыя забаставалі. Іх патрабаваньні былі самыя сьціплыя. Яны патрабавалі 8-мігадзіннага рабочага дню, прыбаўкі пэнсіі, добрых адносін—называць на «вы», а не на «ты» і г. д.

Але гаспадары «Ленскага Таварыства» не жадалі ўступіць ніводнай капейкі з сваіх прыбыткаў. Яны атрымоўвалі чыстага прыбытку амаль на 6 мільёнаў р. у год, але рабочым у адказ на іх патрабаваньні пасылалі сьвінцовыя кулі... Дзясяткі рабочых былі растрэлены пад камандай царскага жандара ратмістра Трашчанкава.

Усё гэта адбылося ўсяго 15 год таму назад. А цяпер імпэрыялістычныя драпежнікі ў Кітаі хочуць патапіць у патоках крыві рух мільёнаў працоўных, засыпаць іх сталью снарадаў, сьвінцом кулаў, парабаціць вялікую кітайскую краіну.

Ім гэта не ўдасца, як не ўдалося парабаціць расійскі пролетарыят!

Кузьняцоў—дэпутат ад рабочых у Дзяржаўнай Думе кінуў калісьці заклік: —Хай ленскі растрэл паслужыць нам повадам для організацыі рабочых, для дружнай організаванай барацьбы!

І сёньня мы скажам нашым братом — кітайскім рабочым:

— Хай шанхайскі растрэл паслужыць вам повадам цясьней згуртавацца пад сьцягам кітайскай компартыі для дружнай, організаванай і пераможнай барацьбы з капіталам і яго катамі.

Што робіцца на сьвеце

Міжнародны агляд за тыдзень.

Апошнія дні міжнароднае жыцьцё нам прынесла шмат навін. Самае галоўнае з іх гэта—

падзеі ў Кітаі.

Як вядома зараз кітайскай революцыяй кіруе партыя Гаміндан, у склад якой уваходзяць комуністы, рабочыя, сяляне, рамесьнікі, саматужнікі, гандляры сярэдняя і нават буйная буржуазія—капіталісты. Усе групы, якія уваходзяць у Гаміндан, хочуць дамагацца незалежнасьці ад замежных капіталістых—капіталістымі, а таксама са сваімі ўласнымі супроць революцыйнымі генаралами, якія дапамагаюць чужаземцам зьняволіць Кітай.

Але у той час, як комуністы, революцыйныя рабочыя і сяляне, якія складаюць леве крыло Гаміндану змагаюцца за тое, каб пасьля агульнай перамогі стварыць у Кітаі рэспубліку рабочых і сялян—рэспубліку саветаў, буржуазія, якая складае правае крыло Гаміндану, змагаецца за тое, каб у Кітаі была буржуазная дэмократычная рэспубліка, у якой капіталісты мелі-б магчымасьць прыгнечаць працоўных.

Гэта значыць, што кітайскай буржуазіі зайдросна, чаму гэта кітайскіх працоўных эксплёатыруе чужаземная буржуазія, а не яны, кітайская буржуазія. Вось чаму пакуль нацыянальна-революцыйная армія змагалася з супроць революцыйнымі генаралами і чужаземнымі імпэрыялістымі, кітайская буржуазія таксама змагалася за нацыянальную революцыю. Але як нацыянальная революцыя амаль ужо канчаткова перамагла і працоўныя масы пачалі тварыць сваю пролетарскую революцыю, тады кітайская буржуазія спалохаўшыся пролетарыяту здрадзіла яму і революцыі і падняла сьцяг паўстаньня супроць рабочае клясы.

Гэтым і тлумачыцца, што 12-15 красавіка галоўнакамандуючы нацыянальна-революцыйнай арміяй Чан-Кай-Шы, які зьмуляецца правадыром правай--буржуазнай часьці Гаміндану, растрэльваў рабочыя дэмонстрацыя, разагнаў прафесыянальныя саюзы, арыштоўваў і растрэльваў кітайскіх комуністаў.

Буржуазная частка Гаміндану ўчыніла раскол партыі,

фактычна прадалася чужаземным імпэрыялістым. Задачай комуністычнай партыі і кітайскага пролетарыяту зьмуляецца павесьці рашучую барацьбу з супроць-революцыйнымі генаралами--здрадніками і буржуазіяй, узмацніць леваё чаўо Гаміндану, згуртаваць вакол яе революцыйных рабочых і сялян, давесьці распачатую революцыю да пераможнага канца.

Здраднікі нацерпяць пераможнае таму, што супроць іх варожа настроены пролетарыят, а таксама революцыйнае селянства, якое пачало тварыць сваю сялянскую революцыю: паліць абшарніцкія маёнткі, дзяліць сялянам буйныя абшарніцкія гаспадаркі, іх зямлю і г. д.

Бандыцкі наскок на наша пасольства.

Нельга моўчкі прайсьці міма тых падзей, якія былі незадоўга да адраднiцкага паўстаньня,—гэта бандыцкі наскок контр-революцыйнага войску генарала Чжан-Цзо-Ліна на наша пасольства (прадстаўніцтва) у Пекіне і консульства у Шанхаі. Чужаземная буржуазія, якая згуртавала у Кітаі вялізарнае войска, на можа асьмеліцца адкрыта распачаць вайну з Кітайскай революцыяй. Ёй трэба, каб як небудзь прымусіць нас вазваць з Кітаем і тады-бы яна атрымала магчымасьць уступіць у вайну нібы для «абароны» Кітаю. Гэта значыць вельмі проста, чужаземная буржуазія хоча нас справацыраваць на вайну.

Нас правакацыяй ня возьмуць.

Урад саюзу ССР у адказ на ўсе учынкі супроць нас адказаў, што нас правакацыяй ня возьмеш, бо палітыка ССР за ўвесь час яго дзейнасьці мае выключна мірны характар. Нам больш усяго патрэбны мір, спакой, бо мы хочам мірна будаваць нашу сацыялістычную дзяржаву. Мы высунулі цэлы шэраг патрабаваньняў, якія навінны быць здавалены кітайскім урадам. Пакуль будзе хоць найменшая магчымасьць дагаварыцца з любым нашым ворагам, мы будзем дагаварвацца, бо не хочам вайны. Але калі хто захоча адведаць моц савецкага кулака на сваёй сьціне, ён упэўніцца, што СССР на гэтулькі мацутны, што не дазволіць ніякіх нападаў на яго.

Выраішэньне спрэчных пытаньняў з Швэйцарыяй.

Моц СССР, упартая воля працоўных масаў нашага саюзу да мірнага ўладжаньня усіх непаразуменьняў, якія ёсьць паміж намі і іншымі дзяржавамі, лепш усяго відаочна на вонкае выраішэньня спрэчных пытаньняў паміж СССР і Швэйцарыяй.

Больш трох гадоў цягнуўся канфлікт СССР з Швэйцарыяй, дзе быў у 1923 годзе забіты наш дыпляміт т. Вароўскі. СССР тады патрабаваў ад Швэйцарскага ўраду (там ён называецца Саюзная рада), каб ён узяў на сябе ўсю адказнасьць за гэтае забойства. Швэйцарскі ўрад, якому загадвалі фашысты, не хацеў тады задаволіць нашы запатрабаваньні. Рост і ўзмацненьне СССР пераканалі Швэйцарскі ўрад, што трэба згадзіцца на нашы патрабаваньні і ён згадзіўся.

Лазар Маплан.

Узарвём папяровую гару!

Комсамольскі дынаміт і савецкая грамадзкасьць узарвуць папяровую гару бюрократызму і валаніты.

Пра анопальскія заявы і шкляную гару.

Тут для нас, жыўучых у горадзе, штодзенна чытаючых газэты, празумелымі зьяўляюцца бюрократызм, валакіта, але там, куды газэты трапляюць радка, там гэтыя словы на зусім зразумелы. І з-за гэтых зялёных бюрократаў і валакітчыкаў сялянін лаюць Савецкую Ўладу, кажуць паміж собою, што Савецкая Ўлада не клапаціцца аб добрабыце, і, кажучы так, спадзяецца, што „Савецкая ўлада нас без увагі пакінуць не павінна". І гэта, бязумоўна, правільныя, дзёчныя жывады сялянін-практыка.

* * *

Сялянін Мікіта, скончыўшы сёлета ліквпункт, адпойчы, сядзячы ў хаце, чытаў пашэртыя лісты газэты. З нежаласьцю, па складох вымаўляў: бю-ро-бюро-кра-а-ты і вал-а-кіта...

Вось ліха! Ніяк не зразумеш... Што такое „бюро", дык ведаю (сёньня Хведар пазаў Сьцяпану: хадзем на пасяджаньне бюро), але пры чым тут „краты"... Краты толькі ў турмах на вокнах, ды краты у нас на полі вазіцца—зямлю рыюць... А далей:—„Вала"—звычайна прадаюць на мяса, ды нашыя хлопцы валамі зямлю апрацоўвалі, ну а прычым тут „кіта",—кажуць дзеці, што кіт—гэта рыба вялікая, якой у нас няма, што спазнаць нельзя, але вось сюды туды склаў гэтыя дзе словы: вала—кіта, і атрымалася тое, што ніяк ад ло Санст пазбавіцца ня можа. А пара, дагэбог пара...

* * *

На прызбах дваровых хат былога радзівілаўскага майнтку „Анопаль" зьбіраліся будучыя пасялкоўцы. Прыгожае сонейка прывітліва ўхмылялася, быццам напамінала сялянам аб цяпыходзе весны, і рыхлае зямлі ў яёй працы на полі. Анопальцы палі гутарку—як лепш выйсьці на пасёлкі,—зямлеўпарадкаваньне. Іхнія думкі абыліся. Адзак—бяда, на кінуты гаспадарку прыехаў на 2-3 месяцы. Мала зямлі. Ніяк не чым гаспадарыць. І вырашылі анопальцы падаць заяву аб прызнаньні іхнім у Самахвалаўскі Райзэмаддзел. Вось тут і пачынаецца гісторыя. Вось тут пачатак вала-кіта...

* * *

Пакольні загадчык Самахвалаўскага Райзэмаддзелу быў чалавек спрытны, па толькі ён гэтая сама спрытна чыркануў на заяве чырвоным „загадчыцкім" атрыманым: „Здаволіць просьбу, дзеля выкананьня перадаць Самахвалаўскаму земляўпарадкаўцу тав. Пашчэнку".

А Пашчэнка чалавек, ведаеце, ціхі. Пашчэнка важнецка падкруціў свае рыжанькія вусікі, і пагледзіўшы на рэзолюцыю, напісаную чырвоным атрыманым, прабурчэў: — заняты Спраў у мяне шмат. Не адны анопальцы. Пачакаюць, зямлі іхняй я ў кішэню сабе не вазьму". І праўда, зямлі анопальскай таварыш Пашчэнка сабе у кішэню, ня ўзяў, а вось дык заява анопальцаў з Заваўскай рэзолюцыяй была пакладзена ім у кішэню, і... стрэчана (у яна кішэні заўсёды глыбокія, а пашчэнкаўскія кішэні, відаць, плыткія...).

Ну вядома анопальцы народ дасьцінны. Бах, ды заяву са скаргай у Менскі Акруговы Выканаўчы Камітэт... Але... як відаць лёс ужо такі.. Загінула і гэтая заява у вялізарных папках акрыканкомаўскіх спраў... Ні слуху, ні духу...

Трэцяя заява была напісана у Наркамзем.

Наркамзем—цэнтральная установа. Яна толькі дае загадзі. Так было і тут. Коратка, ясна было напісана на ловым радку заявы анопальцаў:

„У АКРЗА.—Фільтаву. Разглядзіць гэтую справу.
Шышкоў".

А ў Акрзе выдадоена была давядка:

> Менскі Акруговы Зямельны Аддзел
> Заяву атрымаў
> Увах. № 339. 8-1-1927 г.

Ляжыць гэтая трэцяя заява анопальцаў у АКРЗА тыдзень, другі, трэці, і толькі, калі яна пачала ляжаць у папцы чацьвёрты тыдзень Акрза накіроўвае яе ў Самахвалаўскі РВК.

Блуканьню іхніх заяў анопальцы ня ведаюць. Падалінача чакай. Але і цярпенньне лопнула нішчо ў лістападзе мінулага году, бо 29 лістападу анопальцы падалі заяву у Самахвалаўскі РВК у якой між іншым пішуць:

„Нашы заявы вандруюць ад установы, а адказу няма. На гэты раз маем надзею, што наша заява будзе разглядзена".

А якраз гэтыя заявы анопальцаў вандруюць... ня спужайцеся... тры гады...

* * *

На сьвеце існуе адна старая, цікавая казка. Завецца гэтая казка так: Пра шкляную гару і зачараваную царэўну".

Казка кажа: Колькі ня было сьмелых людзей, якія хацелі зьняць чары з прыгожай царэўны, адзак гэта ім не ўдавалася, бо востра калкутыя коні не маглі ісьці па сьлізкім шкле. Ступяць, пройдуць крыху, ды з гары у прапасьць...

Але знайшоўся адзін такі чалавек, які выратаваў царэўну. Ён забіў рысь, адрэзаў ад яе пазуры і прымайстраваўшы да сваіх рук і ног мала-па-малу ўцерпіва забраўся на вяршыню гары, у замак, і зьняў чары з царэўны. І як чары былі зьняты, гара зьнікла.

Дабярэмся і мы да вяршыні, праўда не шкляной, а папяровай гары бюрократызму і валакіты. . гара тады зьнікне.

А. Кацовіч
Ярмакевіч.

Паміма біржы

Галоўнае—яны яшчэ абараняюцца. Здаецца—проста: выкрылі на протэкцыянізьме—прыпанайся, што вінаваты, бо справа-ж не ў зьняважанай асобе.

Маецца у Менску коопэратыў такі Кустэмкоп. У коопэратыве—штат, а над штатам—старшыня.

А ў старшыні

— Протэкцыянізм.

Выяўлена, што з 36 супрацоўнікаў гэтага «корпу» амаль 60 проц. прынятыя паміма саюзу, паміма біржы працы:

Прыстроіліся спрытныя людзі і гандляры, домаўласьнікі... Прыкашчык мучнога лабазу т. Алы прыняты на службу, праведзены ў штат за тое, што ён домаўласьнік. Якраз за гэта Кустэмкопу патрэбна было памяшканьне. Ён хоча арандаваць яго ў гр. Алага. Але Алы кажа:

— Дайце мне рапей пасаду...

Яму «даюць пасаду». Яго праводзяць у штат...

Акруговая кантрольная камісія констатуе той бязумоўны факт, што старшыня Кустэмкопу т. Левін трапіў у дробнабуржуазнае асяродзьдзе...

Факт, як бачыце, А. Левін адмаўляе:

— Я стары революцыянэр... я вытрыманы.

Але, ня гледзячы на ўсе апраўданьне, АКК пастанавіла:

— Тав. Левіну суровы выгавар.

— Зьняць з працы. Гр.

БЮРОКРАТЫЧНАЯ ЭНЦЫКЛЁПЭДЫЯ

АНКЕТА—нешта падобнае на доўгамотраную кіно-стужку, якая звычайна кончаецца трагічна.

ВАЛАКІТА—цікавы мужчына струмат, на яго замест струн навінчаюцца нарты прасіцялаў. Прыводзіцца у рух ручкай... рэгістратара.

ГАЛОЎБУХ—асоба, якая бухае на галаве дзяцінаю ніжняй палатай по ўтрыманьню апарату.

ЖУРНАЛ—бывае „уваходзячы" і „выходзячы". Але з абодвух няма ніякага выхаду.

КАМАНДЗІРОЎКА—вандраваньне, у час якой „працаўнік" адчувае сябе „камандзірам".

НАЕМ СЛУЖАЧЫХ—магчымасьць правіць найлепшую прынцыпы да радні.

ПРАДСТАЎНІЦТВЫ—установы на чало з асобамі, якія часта не прадстаўляюць сабе нават, каго яны, уласна кажучы, прадстаўляюць.

ПОРТФЭЛЬ—памяшканьне, у якім разам з старымі газэтамі знаходзіцца душа сапраўднага бюрократа.

ЦЫРКУЛЯРЫ—асобны від шкодніцтва (горш чым сарана), якія зьнішчаюць усякую жывую справу.

ЯЧЭЙКІ КП(б)Б і КСМ—косьць у горле бюрократа.

Галоўны рэдактар энцыклёпэдыі
Міхась Камчадал

„Родныя" малюнкі жыцьця-быцьця.

З другога канца.

Комсамол працуе не на такой высьце, дзе нікога няма. Ён датыкаецца штодзённа з самымі розныміўстановамі і людзьмі. У шэрагі саюзу пранікаюць і водгукі тых адмоўных зьяўішч, якія могуць месць месца ў сучасны момант у нашай краіне.

Але трэба загадзя агаварыцца. Праўда, у нашым саюзе сустракаецца бюрократызм. Праўда, ёсьць сярод саюзных актывістых асобныя хвацы, якія заражаны гэтай хваробай. Але ў цэлым наш саюз не бюрократычная організацыя. Работа саюзу заснована на самадзейнасьці мас. А бюрократызм абрашкаджае самадзейнасьці, душыць яе.

За жывога чалавека—супроць паперы.

Здараецца, што ведзіць ў якім небудзь камітэце саюзу хлапчына. Пасяджаньні, камісіі, сутаргана, мітусіна, а для сапраўднай справы і часу не застаецца.

І замест таго, каб заўсёды быць сярод людзей, хлапец адгараджваецца ад іх паперамі. Протокол, цыркуляр, адносіна, распараджаньне,—вось гэтыя папяровыя таварышы замяняюць такому актывісту гутарку з людзьмі. А, нарэшце, можа атрымацца так, што паперы зробяцца для яго важней чалавека.

Адрыў ад масы.

Такі хлапчына губляе сувязь з масамі. Яму няма часу ехадзіць у ячэйку, ён не наведае заводскіх сходы, ён ня ходзіць у клюб.

Калі наведае ён і заводзкім ці сяляніным хлапцам, дык толькі дзе таго, каб даклад зробіць ім. Адбарабаніць свой даклад—і пойдзе.

Адгароджаныя сьценамі свайго кабінету ад мас моладзі такі саюзны актывіст нарэшце пачынае працаваць не з дапамогаю мас, не ўцягваючы іх у жыцьцё саюзу, а каміма мас, праз іх голаву. Вось у гэтым і сказваецца бюрократызм.

Адзін за усіх.

Трэба стварыць якую-небудзь камісію—наш хлапчына тут як тут. Трэба тэрмінова ўкінуць заданьне—ён сам бярэцца за яго. Трэба выпусьціць насьценную газэту—ён сам піша амаль усю яе. Ён—майстар на ўсе руні. Як кажуць: і шавец і жнец, і ў дудку ігрэц.

А саюзная маса стаіць у баку ад работы. Яна адыходзіцца ад жывой справы. Гэты актывіст усё захопліва сабе.

І жыцьцё ў гэтай ячэйцы ці організацыі саюзу—камінуча замірае.

Руна руну мые.

Але на кага небудзь апірацца гэтаму актывісту трэба. Бо сам сабе ён прыдумаць на можа. Яго навіны падтрымоўваць і абіраць. І пачынае такі актывіст падбіраць аварат для сябе.

Вядома, вельмі добра, калі ў камітэтах і бюро ячэек саюзу сядзяць хлапцы дружныя, між сабой ня б'юцца, але і ня сварачаюць, разам робяць карысную справу.

Але бяда, калі гэтая дружба пераператвараецца ў круговую паруку, калі сядзяць людзі і падтрымліваюць адзін аднаго, скрываючы і замазваючы свае памылкі і недахопы...

Аб падхалімах.

Каля бюрократа ў саюзе групуюцца звычайна падхалімы, людзі, якія думаюць не сваім розумам, а розумам свайго начальніка. Падхалім заўсёды гледзіць у рот старэйшаму на чыну. Скажа той „так"—падхалім згодна ківае, скажа начальнік „не",—падхалім зараз-жа адмоўна ківае галавой.

Сваёй думкі ў падхаліма няма. А калі часам і здараецца, што ён адважыцца выказаць яго, дык трэба толькі начальству не згадзіцца, як падхалім ужо гатоў узяць сваю думку назад.

Чым шкодзен нам бюрократызм.

У такіх формах можа праўляцца бюрократызм у саюзе. Неабавязкова, каб усе названыя намі рысы былі ў аднаго чалавека.

Бюрократызм перашкаджае саюзу выхоўваць з моладзі сапраўдных бальшавікоў-ленінцаў, прыцягваючы ёй адчуваньне чыста пачытаньня і падхалімства.

Ён бюрократызм перашкаджае шчо больш ажыцьці працу саюзу, замяняючы ў ім практычную працу ворахам паперы.

Пад абстрэл.

Вось чаму комсамольская організацыя павінна ўзяць у штыкі асобных бюрократаў, якія сустрамляцца ў яе шэрагах: трэба імкнуцца выбіць глебу з пад ног бюрократызму

Нехай кожнага бюрократа і падхаліма організацыя нагародзіць пагардаю і, калі ён, не гледзячы ні на якія наказаньні і таварыскія нарады, не спраўдзіцца, выгнаць яго з сваёй асяродзьдзя.

Нехай кожны комсамолец уразумее неабходнасьць чуткі, беражлівы, па-жыцьцёвы адносіцца да кожнага рабочага і селяніна,—тады бюрократызму ня будзе месца ў Комсамоле.

Зьм. Ростоў.

„Сьвятыя цуды“ на клюбнай сцэне

Матар'ял для антырэлігійнага вечару на вялікдзень

Бязбожныя гульні.

Запалі кадзіла.

Гуляецца, як у гаралкі. Усе становяцца пара за парай. Вадзячы стаіць наперадзе і крычыць:

— Я поп Гаўрыла, сіняе рыла. Проскаркамі нарылюся, з кулакамі знаюся, комсамольцаў у царкву клічу, добра ім жычу. Задняя пара малітву зацягвай, для мяне кадзіла распальвай.

Задняя пара разьбягаецца і бяжыць, каб наперадзі злучыцца разам. Вадзячы поп ловіць. Калі вадзячы аднаго зловіць, тады парай становіцца наперадзі, а той, хто застаўся рабіцца вадзячым папом і г. д.

Манахі.

Удзельнічаюць 20-30 чалавек.

Гульцы дзеляцца на дзьве групы. Адна льнуліецца манахамі, другая—багамольцамі. Манахі, узкушыся за рукі, подыходзяць да багамольцаў, пакланяюцца. Абудвы бакі павінны трымацца спакойна і захоўваць сур'ёзныя мімы на твары.

Пасьля паклону, адзін з манахаў павінен сказаць які небудзь жарт, напрыклад:

— У нашым манастыры цуда адбылося, баця ігумен сабачым голасам завыў.

Багамольцы адказваць:

— А ў нашай вёсцы калодзеж малітву прапеў.

Манахі зноў гавораць:

— Нам прыгодзілася жаба з Афону сьвятой вады прывезла, ад усіх сваро выдечае.

— А ў вас сельсавет пруд захмарэў, высох увесь, ці ня вылечыце яго?

Прагульвае той бок, які раней расьсьмяецца. Чым жартаўлівей праходзяць размовы, тым гульня набывае больш цікавасьці.

Рэлігійны дыспут.

Удзельнічае ў гульні 30—40 чалавек.

Усе гульцы дзеляцца на 2 партыі, кожная выбірае сабе камандзіра. На краях пляцоўкі, на адлегласьці 30 крокаў адзін ад другога ставяць два «папы». Адзін зьлучаецца папом, другі—сэкстантам.

На адлегласьці 10 крокаў праводзіцца лінія. Кожная партыя строіцца па лініі, тварам адна да другой і сьпінамі да чуцалаў—«папоў».

Па сыгналу гульцы кожнай партыі стараюцца зьбіць палкай «папа» супраціўнай партыі. Калі «поп» зьбіт—становіцца зноў і гульня працягваецца.

Кожны зьбіты «поп» лічыцца за адно выгуленае ачко той партыі, гулец якой зьбіў. Гульня працягваецца да умоўленай колькасьці ачкоў.

Гульцы кожнай партыі кідаюць палкі ў «папа» па чарзе. У гульца, які кідае палку адна нага павінна абапяршкова знаходзіцца на лініі.

Месцам для гульні выбіраюць вялікую роўную пляцоўку. Папа ставяць у кола пробачнае на зямлі рыскай.

В.

Фокусы і наву ковыя забавы

• Выкліканьне „духаў“.

Гэты вопыт можна праводзіць на розным. Адзін з самых простых вопытаў заключаецца ў наступным.

Узяць два сподкі ці шырокіх кружкі і наліць у адзін з іх моцнай салянай кіслаты (дымящай), а ў другі—моцнага нашатырнага спірытусу і паставіць іх побач так, каб іх глядач ня бачыў, з заду іх добра нацягнуць кавалак чорнай матэрыі—лепш за ўсё кавалак чорнага аксаміту, але можна ўзяць і з чорнай паперай або чорным калінкорам. Як толькі газы, што падымаюцца з салянай кіслаты і нашатырнага сьпірытусу, пачнуць зьмешвацца зараз-жа яны пачнуць злучацца адзін з другім, у выніку такога злучэньня ўтварыцца белы дым, які саста́ніць з маленькіх белых крышталікаў. Гэты дым настолькі лёгкі, што падніма́ючыся ўверх, ён перавіваецца струйкамі так, што простым рухам рукі ці лёгкім дунавеньнем можна перамяніць яго фігуру і ўнушыць гледачам, што прад імі знаходзіцца сапраўдны дух ці здань.

Гэты вопыт будзе мець вялікі посьпех пры той умове, калі ён будзе праходзіць у цёмным пакоі ці на неасьветленай эстрадзе і пучок сьвятла, хоць бы ад кішэннага электрычнага ліхтарыка будзе накіраван толькі на слуп узьнімаючагася дыму.

Абнаўленьне абразоў.

Для гэтага трэба дастаць які небудзь нацямнелы абраз і абмыць яго з паверхні рашчынам з шкіпідару і сьпірытусу (поравну); пры гэтым рашчыняецца самы верхні пласт лаку, на якім звычайна і знаходзіцца ўся грязь. У выніку такога праціраньня выкрываюцца ніжэй ляжачыя пласты фарбаў і абраз становіцца сьвятлейшым.

Абнаўленьне можна правесьці прад аўдыторыяй, бо яно не займае шмат часу

Сьцеражы здароўе!

(Нарада пры газэце „Чырвоная Зьмена“).

Гэтымі днямі адбылася нарада па пытаньню аздараўленьня рабочай моладзі, організаваная радакцыяй «Чырвонай Зьмены», Наркам Аховы Здароўя і Менакругкомам ЛКСМБ.

Адчыніўшы нараду, тав. Барашка падкрэсьліў, што:

Нам сёньня трэба больш-менш падрабязна вызначыць шляхі, якія павядуць к канчатковаму аздараўленьню рабочай моладзі.

Што сказаў прадстаўнік Наркамздрава.

Тав. Гэрман. (Урач—ад Наркам аховы здароўя). Матар'ялы распрацаваныя намі на грунце асабістага допыту, выявіў, што з рабочым днём падлетках, у нас ня ўсё добра. Рабочы дзень амальшто заўсёды правышае норму вызначаную кодэксам закону аб Працы.

Нарада сказала:

За гарачы абед, за разумнае і прыемнае скарыстаньне летняга водпуску!

Процант моладзі, занятай на начной працы складае—13,6 проц., што дае павялічэньне з мінулым годам. Асабліва гэта назіраецца ў шкляной-фарфаравай прамысловасьці, дзе малодшыя групы моладзі больш уцягнуты ў начную працу чым старшыя.

Хлапцы п'юць

У сувязі з павышэньнем заработнай платы, слабасьцю культурна-масавай працы, мы маем значны ўзрост ужываньня алкаголю. У Менску, як відаць на распрацованым анкетам такі процант сярод моладзі—складае 19,6 проц. хлапцоў; сярод дзяўчат п'юць 3 проц (Значная колькасьць спрод ужываючых алкаголь, падае на прафсаюзы: — друкароў, гарбараў і мэталістаў).

Па пытаньню кармленьня—выявілася што 3 разы у дзень кормяцца—79,9 проц., адзін-два разы—11 проц. Гарачую страву ўжываюць штодзенна—70 проц., не штодзенна—12,2 проц.; 1,4 проц. зусім ня ўжываюць гарачай стравы. Мяса—гэта элемэнт, неабходны ў страве, а яго ядуць штодзенна толькі—36 проц., 7 проц. зусім ня ўжываюць мяса, 10 проц.—адзін раз у тыдзень.

Няма палепшэньня квэтэрных умоў. Вырас процант тых, якія жывуць сумесна. Значная колькасьць ня мае сваіх ложак, многія сьпяць сумесна, па два, а тэ і пятры на адным ложку.

У параўнаньні з мінулым годам упрос процант сухотных (з 8—10 проц.), малакроўных—32,4, хворых нервовай сістэмай—2,5, хворых сэрцам — 5 проц. Хворых больш сярод нурэйскай моладзі у параўнаньні з беларускай.

У чым адчувае ціпер патрэбу моладзь? 37,6 проц.—адчуваюць патрэбу ў лячэньні і падмацаваньні свайго здароўя, а іх 30 проц.—у санаторным і курортным лячэньні, 12 проц.—у амбулаторным і частка ў больніцным лячэньні.

У першую чаргу неабходна палепшыць квэтэрныя ўмовы, пра-ніць усе магчымае, каб квэтэрныя умовы пасраўніць на належную вышыню. У чым-бо то ні стало—дабыцца рацыянальнага скарыстаньня зарплаты моладзьдзю. Улетку мы маем шараг безгранковых магчымасьцяй. Гэта тое, што у шырокім урахуменьні мы заві́м фізкультурай.

Есьць шэраг і другіх рэальных магчымасьцяй; як пабудова калёніі, пашыр грунай дачу і інш.

Больш месц у дамы адпачынку

Цэха (скураны завод). У мінулым годзе памятую пры мадаглядзе, шмат гаварылі пра дамы адпачынку, куды моладзь атрымала 15 проц. з усіх месц.

У далейшым трэба арабіць так, каб моладзь атрымала 15 проц. з агульнага ліку ўсіх месц, а не па прадпрыемствах.

Неабходна вялікая упартасьць.

Тав. Каган. (ЦСПСБ). Вынікаў мы агляду мінулага году мы на масе. Вынікі толькі могуць быць скарыстаны навуковай мэтай.—Профсаюзы наконт месц у домах адпачынку заўсёды сярэчаюцца з комсамолам. Гэта з прычыны не вялікіх рэсурсаў. Я-б прапанаваў даць грошы Вам па пабудову калёніі моладзі, а комсамол адмовіўся ад месц у домах адпачынку. Наогул, трэба сказаць, што для паляпшэньня становішча рабочай моладзі неабходна вялікая упартасьць прадстаўнікоў моладзі на прадпрыемствах.

Т. т. Давідсон, Брадоцкі, Пінхасік і іншыя гаварылі, што:

— Мала увагі звяртаем на кустарную моладзь, якая працуе ў вельмі дрэнных умовах. Памяшканьне не апальваецца, хлапцы ўзімку мерзнуць.

— Перад пасылкай на працу падлетка не падлягалі медагляду, з прычыны чаго ці іншая праца дрэнна адбіваецца на здароўі моладзі.

— Улетку неабходна будзе кожнаму свой чарговы водпуск рацыянальна скарыстаць. У некаторых таварыствах есьць магчымасьць паехаць у пёску да знаёмых, дае ўмовы для адпачынку куды лепшы гарадзкіх.

— Перад намі стаіць ціпер задача—даць прадпрыемствам больш тавары сьпіданьні. Вось мы ціпер беспрацоўным адпушчаем абеды па 15 кап.

Мы ціпер аддаём шмат увагі на тое—які развозіць гарачую страву па прадпрыемствах. Прадстаўнікі моладзі і прадпрыемствах павінны больш энэргічна дапамагчы нам у гэтай справе.

* * *

Шкэйдэр (АК ЛКСМБ). Мы ціпер павінны паставіць перад сабой задачу—пасылаць на пытворчасьць толькі здаровых падлеткаў.

У спрачках на нарадзе яшчэ выказаліся т. т. Бухман (швэйпрам), Плотіцін, Малніна, Жэлябін, Авенштат, Перэльман.

Ісьці ў ногу з жыцьцём, з працай!

Абгаварэньне лісту замужніх комсамолак Менску.

Муж-комсамолец б'е жонку.—Голас віцебскіх замужніх комсамолак.—«Гэтакія нарады трэба склікаць часьцей».—Асобна склікаць комсамолак, маючых дзяцей.

Вось драць бацінкі ахвота!

Нарада замужніх комсамолак Бабруйску.

Атрымаўшы ліст комсамолак Масквы, мы склікалі нараду замужніх комсамолак, якіх у нас налічваецца больш чым 80. Зацікаўленасьць да гэтай нарады была вялікая ня толькі з боку комсамолак, але і хлапцоў.

Абмеркавалі ліст з «Комсамольскай Праўды», пагаварылі аб адносінах замужніх комсамолак да грамадзкай працы, адносінах к ім з боку комсамольскіх ячэек, мужоў—комсамольцаў, партыйцаў. Дакладу ня было. Высунулі толькі шэраг пытаньняў. Выступіла 15 чалавек.

— Ячэйкі не нагружаюць нас працай, над намі сьмяюцца, выкідваюць розныя славечкі. Бывае і мы саромімся ісьці на сходы.

— Калі замужняя комсамолка ўходзіць у водпуск, ячэйкі гавораць, «што трымацца з ёй, сходу не наведвае, трэба выключыць».

— У сямейным быце, у нас няма розніцы з старай мяшчанскай сям'ёй: жонка цалы дзень занята з дзіцяцем, яна навіна арганізоўваць хатні ўют, бываюць выпадкі, калі муж партыец, у сямейным быце зусім забывае сваю партыйную вытрымку, часта чуеш славечкі: «Ну, цябе з тваім комсамолам, што ты атрымліваеш ад яго? Вось трацаць бацінкі ахвота!»

— Мужы-комсамольцы або партыйцы ня дзеляцца з намі аб іх працы ў ячэйцы.

Вось найбольш характэрнае з выступленьняў замужніх комсамолак.

Нарада зацягнулася да 11 гадзін увечары. Прапановы складалі самі комсамолкі. Вось яны:

— Нарады замужніх комсамолак трэба склікаць хаця-б адзін раз у месяц.

— Трэба таксама склікаць нараду мужоў-комсамольцаў, партыйцаў.

— Акрамя агульных нарад асобна склікаць комсамолак маючых дзяцей.

— Паставіць пытаньне ў ячэйках аб замужніх комсамолках.

Якія практычныя вынікі ад праведзенай нарады? А вось яны: замужніх комсамолак цяпер уцягваюць у працу ячэек. Палепшаліся адносіны комсамольцаў да іх.

Лічым, што вопыт скліканьня такіх нарад сябе апраўдае.

Рэнгольд.

У рэзолюцыі, якую прыняла нарада замужнія комсамолкі г. Віцебску цалкам падтрымліваюць ліст менскіх замужніх комсамолак і адзначаюць, што аналягічныя тым фактам, якія прыводзяцца ў лісту Менск. комсамолак, маюць мейсца і ў Віцебскай організацыі.

Нарада выказалася супроць організацыі вячэрніх ясьляў замест якіх прапануе утварыць нядзельныя ясьлі.

Таксама вынесена пастанова каб пытаньне аб замужніх комсамолках абмеркаваць на ўсіх ячэйках Віцебску і яшчэ склікаць сумесную нараду комсамольцаў-мужоў і замужніх комсамолак г. Віцебску.

М. Т-э.

Неабходны нядзельныя ясьлі

(Віцебск)

Віцебскім АК была склікана нарада Віцебскіх замужніх комсамолак. На нарадзе быў пастаўлен на абмеркоўваньне ліст замужніх комсамолак гор. Менску надрукованы ў газэце «Чыр. Зьмена».

Як высьвятліла нарада, у справе працы сярод замужніх комсамолак у ячэйках г. Віцебску далека ня ўсё добра.

Асобныя комсамольцы ня толькі ня зварачваюць аніякай увагі на тое, што яго жанка адрываецца ад комсамолу, а нават дапамагаюць адрыву замужніх комсамолак ад ячэйкі.

Такія выпадкі былі у ячэйках будаўнікоў, дрэваапрацоўнікаў і г. д. У ячэйцы акулярнай фабрыкі муж-комсамолец, нават, садзейнічаў выхаду жонкі з КСМ. Многія ячэйкі самі дапамагаюць адрыву замужніх комсамолак ад ячэйкі—замужнюю комсамолку скарасьцешна зараховываюць у «мёртвыя душы» і не даюць аніякай нагрузкі, гэтым самым дапамагаючы адрыву комсамолкі ад ячэйкі. Прыкладныя выпадкі маюць месца у ячэйках друкароў, фабрыкі «Профінтэрн» і інш.

Бываюць выпадкі і наадварот. У ячэйцы працаўнікоў асьветы. замужніх комсамолак нагружаюць «начем зря», што бюро тлумачыць так: «замужняя комсамолка не павінна адрывацца ад працы».

Шэраг выступаўшых комсамолак адзначылі, што да цяжарных комсамолак маюцца зусім неданусьцімыя адносіны.

Быў нават такі выпадак калі цяжарную комсамолку, (ячэйка акулярнай фабрыкі) муж актыўны комсамолец, (з наменшай актыўнасьцю чым на сходах выступаў у спрачках) дома... біў.

Пятро Глебка

Дзяўчыне

I

Ня думаў ніколі, што вочы багна,
хоць гляне яна маладая.
Казаў 'шчэ учора, што любай няма,
а сёньня ей песьні складаю—
ня думаў ніколі, што вочы багна.

Прашла, толькі косы у ветрах шасьцяць,
усьмешку на вуснах стаіла...
Гадае,—ня ведае сэнсу жыцьця:
няма, кажа, гэтакай сілы.
Прашла, толькі косы у ветрах шасьцяць.

Ці зірк, ці зоры упалі на віс,
саткалі узор бавальніцай.
Глядзець, ці упасьці з радасьцю ніц,—
прытожасьці тай пакланіцца.
Ці зірк, а ці зоры упалі на ніц?

Ці хмары, ці косы, ці можа туман
над рэчкаю ветры гайдаюць.
Казаў 'шчэ учора, што любай няма,—
сягоньня ей песьні складаю—
ня думаў ніколі, што вочы багна.

II

Ты расла, гадавалася ў горы,
пралівала крыніцы сьлёз,
і пашла ад пятнаццаці ў горад
пашукаць сабе долю і лёс.

Не чакаў, калі бачыў калісьці
каля постаці сьнежнага жыта,
што рассыпаеш свой зірк шалясьцёты
на пясок, на гасьцінец набіты.

Дзе-ж з вачэй тваіх дзеліся зоры,
дзе прапала вяселая ўсьмешка?
Ты, дзяўчынка, маўчыш, не гаворыш
ці сябе, а ці іншага пешыш.

III

Запалілі агні, пасьцілаецца сьцень,
пасьцілаецца сьцень на асфальты.
Гета дзень дагарэў і разносяцца дзесь,
і разносяцца дзесь гукі-хвалі.

Пападае у вір і зьнікае той зык,
і зьнікае той зык быццам мары,
толькі горад шуміць і скрыпяць палазы,
і скрыпяць палазы ля бульвару.

Ты выходзіш тады, сустракаеш свой дзень,
сустракаеш свой дзень ты у вечар.
Запалілі агні, пасьцілаецца сьцень,
пасьцілаецца сьцень чалавечы.

IY

Нашто захавала у сэрцы тугу,
ці радасьці можа няма?!
Глянь—вунь трава шалясьціць на лугу,
а учора зьвіваўся туман—
зьвіваўся туман.

Бывае маркота, жалоба і сум,—
я зьведаў такія навалы,
а ўсё-ж маладосьці шчасьлівай вясну
на вотлю ня кінуў на хвалі—
ня кінуў на хвалі.

Бязсуму і радасьць ярчэй не гарыць,
а роспачы, плачу—ня трэба!
Маўклівая хвоя стаіць на гары,
стаіць і глядзіцца у неба—
глядзіцца у неба.

У будняцьць глянь, у мінулае глянь,
(імкнуцца, імкнуліся людзі)
тады ты ня станеш, як белая здань
і плачу ніколі ня будзе—
ніколі ня будзе.

ЧЫРВОНЫ МАЙ, ТАВАРЫШ, СУСТРАКАЙ!

(МАТАР'ЯЛЫ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ СЬВЯТА ПЕРШАГА МАЮ).

Плян дакладу да першамайскага сьвята.

Першае мая—дзень агляду змагаючыхся за сваё вызваленьне сіл міжнароднага пролетарыяту, дзень дэманстрацыі саюзу пролетарыяту з усім працоўным чалавецтвам, прыгнечаным сусьветным імпэрыялізмам.

Вось чаму ў дакладах на першамайскіх сходах з асаблівай чоткасьцю і абаснаваценьнасьцю павінны быць высьветлены пытаньні міжнароднай барацьбы працоўных і сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Будаўніцтва соцыялізму ў СССР.

Дасягненьні на шляху соцыялістычнага будаўніцтва характарызуюцца ростам буйнай прамысловасьці («толькі тады, калі краіна будзе электрыфікавана, калі над прамысловасьць, над сельскую гаспадарку і транспарт будзе падведзена тэхнічная база сучаснай буйнай прамысловасьці,—толькі тады мы пераможам канчаткова»—Ленін), узмацненьнем удзельнай вагі соцыялістычнага сэктару ў агульным гаспадарчым жыцьці краіны, паступовым пераходам вёскі на больш культурныя інтэнсыўныя і колектывістычныя формы гаспадараньня (шматпольле, кооперараваньне сялянства, электрыфікацыя і інш.), ростам капітальнага будаўніцтва, зьмяншэньнем таварнага голаду і г. д.

Некалькі ілюструючых лічбаў:

Павышэньне ўдзельнай вагі індустрыялізацыі ў нашай краіне (прырост у 1925-26 г. у адносінах да 1923-24 складаў для сельскай гаспадаркі 27,6 проц., для прамысловасьці—120,7 проц.), уарост удзельнай вагі дзяржаўнай прамысловасьці ў агульнай індустрыі (доля саматужнай і прыватнай прамысловасьці ў агульнай індустрыі ў 1923-24 г.—27,7 проц., у 1925-26 г.—16,9 проц., 1926-27 г.—ацэнена на ўвазе—15,3 проц.), павялічэньне капітальнага будаўніцтва (1923-24 г.—22,5 млн. руб., у 1924-25 г.—585 млн., у 1925-26 г.—780 млн. руб., 1926-27—947 млн. р., а з затратамі на электрыфікацыю—1.100 млн.), пры чым найбольшым павышэньнем у 1926-27 г. падлягалі затраты на: горныя галіны прамысловасьці (147 проц. ад затрат 1925-26-г. на прамысловасьць па здабычы паліва—вугаль і нафта (133,4 проц. ад затрат у 1925-26 г.), электротэхнічную (132 проц. ад 1925-26 г.). металёвую (125,8 проц.). Прадукцыя дзяржаўнай прамысловасьці ў 1926-27 г. дае павялічэньне супроць мінулага году на 20 процантаў у сярэднім (металё-прамысловасьць—на 23 проц., горна-здабываючая—на 34 проц., буданічая—на 27 проц., паліўная—на 23 проц., хімічная—на 43 проц. і г. д.).

Лічбы вытворчасьці ўнутры краіны і прывозу з-за граніцы сельска-гаспадарчых прыкладаў і машын паказваюць, як пасоўваецца машынізацыя сельскай гаспадаркі.

— Побач з гэтымі буйнейшымі посьпехамі маюцца і шэраг цяжкасьцяй і недалікаў.

Політыка цэн зьяўляецца самым цэнтральным і баявым пытаньнем.

Асноўная наша задача ў галіне політыкі цэн складаецца ў тым, каб за штуку таварў браць дасташай, вырабляць лепшы тавар, павялічваць спрос спажыўца, узмацніць таваразварот, тым самым атрымоўваць большую масу прыбытку і «ускарэць тэмп нашага разьвіцьця, не наталкваючыся на разбураньне сялянства, не пазбаўляючы індустрыі аграрнага сырцу, захоўваючы правільную пропорцыю паміж сельскай гаспадаркай і прамысловасьцю, робячы больш моцным саюз рабочых і сялян, умацоўваючы кіраўнічую ролю пролетарскай прамысловасьці і самога пролетарыяту» (прамова тав. **Бухарына** на 15-й Маскоўскай губпартконфэрэнцыі).

Між тым, па гледзячы на тое, што партыя яшчэ ў маі мінулага году агаласіла барацьбу за сьніжэньне цэн, у нас у працягу першага паруоду кампаніі мела месца павышэньня розьнічных цэн: 1) сьціскаьне «ножніц» паміж цэнамі на сельск.-гасп. і прамысловыя тавары і тым самым узмацаваньне рабоча-сялянскага блёку, 2) сьціскаьне «ножніц» паміж цэнамі на зернавыя і тэхнічныя культуры, каб умацаваць сырцавую базу прамысловасьці.

Пытаньне барацьбы з бюрократызмам

Пытаньні зьніжэньня цэн, адыгрываючы вялічэзную ролю ва ўсім разьвіцьці нашай народнай гаспадаркі, набываюць асаблівае значэньне ў барацьбе з бюрократызмам.

Політыка зьніжэньня цэн, штурхаючы ўперад справу паляпшэньня і рацыяналізацыі нашага апарату, прымушае гаспадарчыя органы натужвацца, а з гэтай прычыны і служыць сродкам барацьбы з бюрократызмам. Пытаньне-ж аб бюрократызму представляе сабой вялізную цяжкасьць на шляху нашага соцыялістычнага будаўніцтва, бо наш апарат надзвычайна заражаны бюрократызмам, валакіта ў вырашэньні шэрагу неадкладных пытаньняў яшчэ і па гэты дзень мае месца, існуючы бюрократычны апарат каштуе шмат грошай.

Уздымаючы сельскую гаспадарку, уздымаем базу прамысловасьці

Апошні год прынёс нам многа сырцовых затрудненьняў у сувязі з скарачэньнем плошчы пасеваў над тэхнічныя культуры.

Гэтыя цяжкасьці ў гэтым годзе трэба перамагчы.

Цяжкасьці, выцякаючыя з пытаньня аб сырцу, таксама ўніраюцца у падняцьце сельскай гаспадаркі. У нас адчуваецца недахоп шэрсьці, скуры, бавоўны і г. д. Гэты недахоп сырцу трэба зьнішчыць шляхам узмацненьня крэдытаваньня сырцавых раёнаў, снабжэньня іх дзяшовым хлебам, устанаўленьня нормальных цэн на сырэц, аказаньня вытворчай дапамогі вытворцам сырцу і т. д.

Спроба імпэрыялістых сарваць наша будаўніцтва

— Наш рост да сьмерці палохае сусьветны імпэрыялізм, а ў першую чаргу, яго авангард—англа-амэрыканскі капітал.

Будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне—гэта начала гібелі для іх. Яны ведаюць і адчуваюць, што па пракладваемых намі шляхох пойдуць і працоўныя на ўсяму капіталістычнаму сьвету яздецца зарая пры услужлівай дапамозе і пад «ідылёгічным» прыкрыцьцём міжнароднай соцыял-дэмократыі бешаная траўля і падрыхтоўка вайны супроць СССР.

На чале гэтай падрыхтоўкі ідзе англійскі капіталізм, на становішчы якога революцыянізуючы ўплыў СССР асабліва сказаўся (рух меншасьці, забастоўка горнарабочых, кітайская революцыя). Варожасьць гэтая выяўляецца ў спробах абкружыць нас колам фашысцкіх дзяржаў (Польшча, Літва), стварыць супроць нас праз шэраг частковых згодаў паміж асобнымі дзяржавамі баявы адзіны антысавецкі фронт (польска-паўднёваслаўскі дагавор, румына-італьянскі дагавор і г. д.) Падрыхтоўка вайны супроць СССР нямысьліма без прыдушэньня рабочага руху. Вось чаму яна саправаджаецца разгулам фашысцкай рэакцыі, жорсткім падаўленьнем революцыйных, выступленьняў працоўных, загон у падпольле комуністычных партый і інш. (Румынія, Польшча, Італія, Англійшчына).

Майская

Па вуліцы Савецкай,
Вясёлай, маладзецкай,
Рабочы май
Таварыш, спатыкай.

Мы сіцблузай сілай
Па майскіх небахідах
Ідзём, расьцём
І радасна пяём.

Вясёлай песьняй-сонцам
Мы ворага прыкончым
Бяладзьдзе мы даб'ём
Магутным кулаком.

Пашлём мы селяніну
І кнігу і машыну—
Машына, кніга, хлеб
Пакогуць кончыць пэн...

Мы знаем—будзь бухы
У Парыжы, у Рыме, у Руры
Ад гэтых самых бур
З фашыстаў сойдзе дур.

Вясёлы май, ты з намі
Уздымай-жа сьцяг наш слаўны
Нахай жыве зямля
Рабочых і сялян.

Частушкі.

З-за хмары, і з-за лесу
Стукне сонейка бяз меры,
Першамай - усясьветны слесар
Адамкне у камуну дзьверы.

На усход як глянеш вокам,—
Шмат нядолі мы змаглі,
Першамай вясеньні токар
Точыць шчасьце усёй зямлі.

Граюць трубы перамогу,
Радасьць вёсак і станкоў!
Мы праб'ем сабе дарогу
Мазалістаю рукой.

Мы будуемся старанна,
Усё сумотнае загінь!
Ходзяць у вёсцы дэманстранты
Разьвяваюцца сьцягі.

Сёньне сьвята, сёньне сьвята
Сьвята першамайскае.
Эх ты вёска, мая хата
Як ты сьвятам маесься?

М. З.

З першым маем, веску вітаем!!

Жывая газэта дзеля першамайскай сцэны.

(Аўтарызаваная перапрацоўка з расейскага Макса)

Уступнае слова.

Гаворыць хто-небудзь з удзельнікаў.

Таварышы, тое, што вы зараз убачыце і пачуеце, завецца жывой газэтай, затым што яна ня пішацца ў насьценнай газэце допісамі, а гаворыцца, так што яе можна паслухаць і разумець кожнаму, нат няпісьменнаму. З гэтага ўсяго вы ўгледзіце, колькі энэргіі прыкладаюць рабочыя гарадоў, каб больш злучыцца з сялянствам, азнаёміцца з усім тым, што хвалюе вёску і што ёй патрэбна. Пачынаем. Давай парад!

(Пад музыку лявоніхі выходзяць удзельнікі газэты абыходзяць кругом сцэну маршам і становяцца пасярэдзіне. Музыка сьціхае).

Чытаюць хорам.

Сягоньня, у сьвята першага Мая
Хай сэрца вяселіць газэта жывая
У некалькіх простых і шчырых словах
Будзе ўсё тут, як на далоні,
Што трэба, каб болей радзілася збожжа
Каб сьпіны ня мулаў агідны заможнік
Хай сьцягі вясеньнім калышацца шумам
Вас з сьвятам сяляне віншуем,
Віншуем!

Пад музыку „Выйду на рэчаньку" ўсе выходзяць тым жа парадкам. Застаецца адзін і чытае перадавіцу ня больш 10-ці хвілін з кароткім яскравым сьціслым матар'ялам аб першым маі. Пасьля вылазіць загрыміраваны дзед-пацешнік)

Дзед.

Здаровы, шаноўныя людзі,
Аб тым сім гутарыць будзем,
Ды я не хаваючы грэху
Дзядок здатны да сьмеху.
Скажу і аб тым як жылося,
Нуды было як у восень.
Плаці падатак пану,
Працуй з рана да рана.
А восьля наша ўзяло,
Стукнулі пану ў лоб,
Ён уцёк,
А мы будуем жыцьцё.
Цяжка Савецкай уладзе
Было усё тут наладзіць.
З граншма было бяды
З папераю нікуды,
Надаюць гатых лімонаў
Хоць засьціпай загоны!
А цяпер сьвет у вакопца,
Маем серабро і чырвонцы.
Чырвонец хоць год ляжыць,—
Як лімон уніз не зьбяжыць.
І яшчэ пашло па усей старане,
Дабіваца каб тавары
Былі танней.
Ды што вы ня верыце, чудакі
Вось дзядзька Паўла цягне цьвікі.

(Уваходзіць Паўла цягне на сабе скрынку)

Здароў, дзядзька Паўла,
што у цябе на плячох за забава.

Паўла

Ды цягнуся дедзьве-дедзьве
Шмат на плячох жалеза.

Дзед

Кацн чудак шкадаваў
Эх, ты, галава!

Паўла

Ды я дзед, ня моў спадзей,
Што толькі цьвікоў дадуць,
Што чуць дайду.
Бывала з гэтым ячменем—
Насыплюць цьвікоў па кішэням.
А цяпер годзе дурыцца
Даюць па поўнай скрынцы.

(Уваходзяць дзяўчаты)

А вы адкуль дачуркі
І што там у вас за клупкі,

Дзеўкі

Ды цэны крыху расталі
Купілі чым болей паркалю.

Баба

І я з імі разам,
Купіла, бачыце газы,
Стала усё цяньней,
Дык чаму ня купіць і мне.

Дзед

Вось бачыце сяляне
Глядзіць на ўсе вочы
На нас рабочы.
Каб лягчэй жылося усім.
Каб шляхі змычкі знайсьці.

Другая частка

(На сцэне два сталы. На адным напісана: «прыватнік», на другім, «коопэратыў». Да прыватніка падыходзіць селянін)

Селянін

Колькі фунт мыла?

Прыватнік

Дванцаць пяць капеек—ня менш.

Селянін

А фунт газы?

Прыватнік

Капеек шасьць.

Селянін

Дорага, зараза!

Прыватнік

Зато усё адным словам, а ў коопэратыве гніёе, бывае што нат запалак колькі там ня рыцца. няма па паліцы.

(Селянін падыходзіць да коопэрацыі)

Сел.

Есьць мыла?

Кооп.

Было, ды сплыло.

Сел.

Эх ты, галава!
А па колькі прадаваў?

Кооп.

Ды я быў рад,
Каб хто за бяцэнак браў.
Было гэтае мыла,
Як гліна.

Сел.

Эх, вы гандляры,
Душу вымеце без пары.

(Выходзіць рабочы)

Рабочы

А чаму, таварышы, так бывае. Гэта з таго, што мы сваім коопэратывам ня цікавімся. Нават ня хочаце найпячыкамі ўступіць. дапамагчы сваімі капейкамі агульнай справе палепшэньня вашага жыцьця.
Ну вось адгадаем адну загадку.
Што трэба зрабіць
І задумацца над тым,
Каб пастачу сялянскую зжыць?

(Сярод глядачоў адзін удзельнік газэты крычыць)

Уступай у коопэратыў.

Трэйцяя частка.

Авіахім.

(На сцэну вкбягаюць два буржуі, напуджаныя яны кідаюцца ва ўсе бакі, а пасьля шпарка абдымаюцца)

Першы

Быў пазтрафалет, Добралет, а зараз, ой божачка, грахі, выдумалі витыхрысты Авіахім.

Другі

А што гэта за зараза.

Першы

Ой браток газы, газыняшчэ раз газы,
Маліся за ратунак душы,
Кажуць, будуць нас душыць.

(рабочы з бутэлькаю)

Першы

Ой, матка боска, вясьльцы!
Штосьці ў яго ў бутальцы?

Рабочы

Зараз усе ўбачыце прыклад,
З якім, буржуй уцячэ рыкам

(Кідае да іх пад ногі бутэльку).

Буржуі

Ой, браце, няшчасьце
Парвецца сэрца на часткі.

(Хістаючыся ўцякаюць).

(Пасьля гэтага ўдзельнік газэты у кароткіх рысах кажа аб карысьці Авіахіму)

Заключная сцэнка.

Кулак і поп (п'юць).

Кулак

Памажы, божа.

Поп

Даніць, божа.

Кулак

Стала жыцьцё ня гожа

Поп

А было як ветачка—рожа.

Абодвы разам

(ківаючы галовамі)

Ой божа, наш божа!

Селянін

(уваходзіць)

Ну найшлі, пузатыя, вон.
Ды бярыце з сабой самагон
Цяпер іншым парадкам
Чарга настала
Будзе тут хата-чытальня
Буду чытаць газэты, ды нават мая жонка Натальля.

Рабочы

(уваходзіць)

Ура! гані іх з двара. Прывёз я кніжок, цэнпату ўсю на ражон. Будзе у вёсцы сьвятлей, коопэрацыя будзе мацнець.

Селянін

Але! Але! Нахай жыве наш Саўз
Прагонім з жыцьця гэты гніёз.

Заходзяць музыканты

Селянін

Эх, Першае Мая сягоньняка
Іграй Мікіта лявоніху.

(Да рабочага)

А ты дарагі госьць
Пойдзем з раз кругом.

(скачуць пад музыку).

Эх сьвята майскае прышло,
Абуджайся ты бедняцкае сяло!

(Заслона)

Едзем у горад Леніна!

Экскурсанты, пасьпяшыце з прысылкай грошай!

У склад экскурсыі залічаны 201 чалавек.

Акрамя таго зацьверджаны 43 кандыдатаў, да іх.

ПАСЬПЯШЫЦЕ З ПРЫСЫЛКАЙ ГРОШАЙ!

Экскурсыйная камісія, вылучаная рэдакцыяй газэты «Чырвоная Зьмена» ніжэй публікуе сьпіс таварышоў, якія зацьверджаны для ўдзелу ў экскурсыі па машруту Менск-Ленінград-Волхаўбуд-Кранштат-Менск.

Усяго паступіла з розных акругаў БССР звыш 400-х сот заявак аб залічэньні ў лік экскурсантаў. З прычыны абмяжованага ліку ільготных ліцераў (з 50 процантнай скідкай) камісія зацьвердзіла экскурсантамі 201 чалавека і 43 чалавек кандыдатамі да іх.

Сьпіс кандыдатаў зацьверджан камісіяй з наступных двох меркаваньняў 1) камісіяй улічана хадайніцтва аб дапаўніцельным прадстаўленьні ільготных ліцераў і 2) магчыма, што некаторыя з таварышоў, залічаных у склад экскурсыі, па розным меркаваньням не змогуць прыняць удзелу ў апошняй і на іх месца магчыма будзе залічыць кандыдатаў.

Камісія напамінае ўсім экскурсантам, што неабходна да 1-га мая ўнесьці палову належачай сумы (17 руб. 50 кап., а для чытуначнікаў, якія едуць па дармовым білетам—11 р. 50 к.). Таксама павінны ўнесьці гэтыя грошы і кандыдаты, каб, пры спрыяючым разьвязваньні пытаньня аб прадстаўленьні дапаўніцельных ліцераў, ня было ніякай затрымкі.

Грошы трэба накіроўваць паштовымі пераводамі па адрасу: «Менск, Комсамольская, 25, кантора выдавецтва «Чырвоная Зьмена» ў касу экскурсыі».

Таварышы, якія спазьняцца з прысылкай грошай (да 1-га мая), будуць з сьпісу выключаны.

Кандыдатам у экскурсанты, якія ня будуць залічаны ў склад экскурсыі, гарантыруецца безадкладны зварот грошай.

Па атрыманьню грошай экскурсантам будуць высланы адпаведныя дакумэнты, а таксама дасканалыя паказаньні аб часе выезду, месцы збору і г. д.

Экскурсыйная камісія.

Сьпіс залічаных у экскурсыю

Менская акруга

Анішчук Г. А.; Ароцкер А. А.; Бэрштэйн Ш.; Барановіч М.; Барашка Н. М.; Брукер; Браўдэ Р. З.; Бычкоўскі П. А.; Васілеўскі Х. Ш.; Вальковіч Ф.; Вальфсон А. Э.; Вайсман Х. М.; Гурэвіч Н. Н.; Гапэнка Ц.; Грыб В.; Гаруновіч М. А.; Грышэвіч Т. Т.; Гуманаў Б. Б.; Давідовіч С. Е.; Жардзецкі М. П.; Затурэнская Ш. Т.; Ізакаў; Ізакава Б. І.; Іофэс; Іваноўская; Каждан Я І.; Канонік Х. Я.; Кульбак І. Ш.; Каган Х. М.; Кулашова М. А.; Кац М. А.; Катлоў Д. М; Ксяцевіч С. А; Костка А. У.; Каплан С. І; Капілаў Д. Н.; Літвіна Ш. Б.; Лапідус Б. І.; Майзэльс Г. Б.; Муяровіч Х.; Маршак С. Д.; Меер Х. Л; Манусевіч І. Э.; Мікулінская Ф.; Маклуш С.Ф.; Матусевіч Я. Я.; Мэронаў В. С.; Олікер Л. Е.; Озерова Е. Б., Перельман Б. І.; Плоткін А. І.; Рашрэй Р. А.; Рычык К. Л.; Сагаловіч Н. І.; Сапожнікава; Сіняк А. В., Гарановіч С.; Татаржыцкі С. М.; Фішкін І.; Філіповіч В. І.; Фрыдман А. С.; Шэмет І. І; Швэндэль Х.Є.; Шыркавец Н. М.; Шэйнман Ш. Ш.; Эйдзінаў Б.; Якшчук М. Х.

Барысаўская акруга

Астапковіч М. П.; Буцько М.; Балабудкін С.; Галай В. І.; Грайфэр С.; Дайнэка Д. М; Дрыпач Д.; Праздоў Р.; Жолцік; Жданаў Р.; Зайдэнбэрг Г.; Захараў А.; Завіленскі В. Г.; Клябанаў Б. Я.; Клябанава Ц.; Казлоўскі А.; Каплан Я.; Кліонскі Л; Казімірчык; Курачкін А.; Казлоўскі.; Лібэрман Я.; Лізавіцкая М.; Лопаронак Т.; Левін М.; Марковіч.; Міндлін Л.; Манкевіч А.; Плаўнік М.; Пінхасік Г. Л.; Рубінштэйн А. Д.; Рубінчык Я. І.; Страдзе; Санцэвіч Т. А.; Сцеткевіч Я. Л.; Таўгэр Ф. Л.; Хацкевіч А.; Чэрнік З.; Цэйтлін І.; Шатаў Н.

Віцебская акруга.

Абрамэнка; Альбэрт Р. І; Булан І. П.; Бабаедаў Д. І.; Вайтушка І. І.; Гусакоў А. І.; Дзьмітрыеў К. Г; Жураў Ф. А.; Казлоў М. Я.; Иурган І. М.; Матвееў М. П.; Моін; Пушкіна; Рашатнёў; Раманаў; Рапапорт С. В.; Собалёў М. Е.; Салектар С. Е.; Станкевіч А. Б.; Сьмірноў Я.; Таўбэ М. Я.; Флейшэр Г. І.; Шэрман І. Ш.; Шлякоўскі І. В.; Шпонаў А. Г.; Шуганава А. Д.

Аршанская акруга.

Зак М. Д.; Лушчык Н. А.; Шаўцоў С. Я.

Слуцкая акруга.

Бародка П. Б.; Верамёў В. М.; Длугашэўскі К. Н.; Дудка А.; Жылка Я. М.; Зарубайка І., Ізомскі М. М.; Кліцэвіч А. В.; Нецліх В. С.; Круглінскі Я.; Міхайловіч В. І.; Салавейчык Н. Р.; Шпілеўскі А. П.; Яцкоўскі А.

Калінінская акруга.

Барысаў Т. С.; Гуцько А. А.; Дземянкоў С. І.; Казлоў С. І.; Карніенка І. М.; Паўлюченка А. А.; Чыжоў А.; Шаковіч М. С.; Валкан Н. З.

Мазырская акруга.

Будовіч М. М.; Віленскі А.; Левін І. Л.; Хадзькоў П.; Чайко Ю. А.; Шаруба І.; Эпштэйн В. І.

Рэчыцкая акруга.

Архіпаў А. В.; Гутман З. І.; Кавалёўскі Л. П.; Кругавой В. Н.; Прызван І. О.; Шаповалаў В.; Шыманец В. Н.; Шылейка В. І.; Шаркала С. І.; Яновіч Н. І.

Гомельская акруга.

Дрыц М. Б.; Кавалёў О.; Прахін Б. А.; Рохлін М. З.; Рыжакоў М. І.; Шпунгіна Р.

Магілёўская акруга.

Баліноўская; Боград Г. М.; Гінзбург Р. Б.; Даркаль П. А.; Ермоленка Д. А.; Жук С. Ф.; Зыкава О. С.; Кашына В. В.; Лабунскі П. І.; Медзьведзкі А. І.; Поўзнэр Г. К.; Пінскі С. М.; Ткачоў К. С.; Узылёўскі Ф. М. Чэраўхін; Цодрык А. С.; Шмуляўцоў Я. Н.

Бабруйская акруга.

Адахоўскі С. С.; Якуткін М. Х.

Сьпіс кандыдатаў

Камінскі І (Менск). Окунь З. М. (Менск). Краўчык Ю. З. (Слуцк). Рубінштэйн І. Л. (Менск). Нікалайшка В. І. (Менск). Сарачынскі В. І. (Менск). Вульф С. Б. (Менск). Лянкорт П. Б. (Менск). Каган І. Б. (Менск). Гаравой Л. І. (Менск). Каждан І. Б. (Менск). Ксяневіч С. А. (Менск(. Цемах Х. Ф. (Менск). Фінкель Г. Н. (Менск). Волкаў Л. Р. (Барысаў). Губінскі А. А. (Менск). Сарочкін І. Ю. (Орша). Шпідзенка Н. М. (Бабруйск). Савалоніч А. Х. (Бабруйск). Клінцан С. М. (Менск). Кантаровіч Л. А. (Слуцк). Эпштэйн А. Ш. (Мазыр). Міраповіч М. А. (Барысаў). Грамштэйн Х. М. (Слуцк). Дзьмітрыенк І. (Менск). Дзкэр М. (Орша). Ядзібрык М. Г. (Менск). Сёўчыка М. Л. (Калінінск). Баськ Р. Е. (Барысаў). Эткіна П. Г. (Менск). Непрашэвіч А. С. (Бабруйск). Рабінэвіч Я. Г. (Менск). Эпштэйн С. С. (Менск). Галянсон А. (Слуцк). Мятліцкі Ю. Ш. (Менск). Максімовіч В. К. (Менск). Мятліцкі І. (Менск). Матлін І. (Менск). Берман А. Е. (Менск). Мрочак А. Я. (Барысаў). Разуноўскі П. Я. (Мазыр). Максімовіч В. К. (Менск). Баралінскі І. Л. (Рэчыца). Кунец (Менск).

Старшыня экскурсыйнай камісіі **Нурцін**

Загад. орг-гасп. часткай **Вержбаловіч**

Адк. сакратар **Анішчук**

Экскурсант, рыхтуйся!

Экскурсыйная камісія раіць усім таварышом, залічаным у склад экскурсыі, загадзя вынясьніць пытаньне аб прадастаўленьні ім 10 дзён водпуску у лік летняга з 13 мая.

Адначасова трэба паклапаціцца аб прысылцы ў касу экскурсыі паловы належачай сумы

Першая заява

Тав. Н. Сагаловіч

Першая заява аб залічэньні ў склад майскай экскурсыі была атрымана рэдакцыяй ад наборшчыка II-й менскай друкарні комсамольца-партыйца НАУМА САГАЛОВІЧА.

Калі ў друкарні прыносьлі набіраць апавяшчэньне аб арганізацыі экскурсыі, Сагаловіч хуценька прачытаў яе, запамёміўся з умовамі паездкі і тут-жа напісаў заяву. 27-га лютага заява ўжо была ў рэдакцыйнай пошце!

Апошняя.

Апошнюю заяву мы атрымалі ад... хм мы яе і не атрымалі апошняй! Вось, бачыце, бянзінь чыпаць—думаю пасьпею... Пакуль, братоў!

Лепшыя.

Экскурсыйная камісія адзначае, што асабліва добра правялі падрыхтоўку да экскурсыі наступныя комсамольскія арганізацыі:

— Нова-Барысаўская (Барыс. акр.).
— Суражская (Віц. акр.).
— Ячэйка заў. „Спартак" (Магіл. акр).
— Ячэйка II-й друкарні (Менск. акр.).

ХТО ЕДЗЕ?

Зацьверджаны склад экскурсантаў па соцыяльнаму становішчу дзеліцца наступным чынам: рабочых—140, сялян—31, служачых—30.

З акруг найбольш поўна прадстаўлены Менская, Барысаўская, Віцебская, Слуцкая і Мазырская.

Зусім не прадстаўлена толькі адна акруга—Полацкая.

У тры радкі.

○ ЦК КПБ скліча ў маі месяцы Усебеларускую нараду працаўніцкіх жанадзелегатаў.

○ З 10-га красавіка па 10-е мая Белдзяржвыдавецтва праводзіць „месяц чытанай кнігі". Зьніжаны кошт на ўсе кнігі, якія выйшлі з друку за 1926 г. на 20 да 90 процантаў.

○ 15 процантаў усіх місц у домах адпачынку і 10 процантаў місц на курортах, згодна пастановы ЦСПСБ, абвешчаны выбіраць на мясцовасьці.

○ Курсы па падрыхтоўцы рабочай моладзі ў ВНУ і рабфакі адчыняцца ў маі месяцы у Менску.

○ У Віцебску адбыўся шахматны чэмпіянат, у якім удзельнічала 19 ігракоў.

○ Наркамасьвіты дазволіў студэнтам БДУ карыстацца ільготнымі білетамі на пастаноўкі дзяржаўных тэатраў.

○ У Рэчыцы арганізавалася першая ў Гомельшчыне літаратурная група „Маладняк".

○ 17-га красавіка пачынаецца Усебеларускі зьезд дрэваапрацоўшчыкаў.

○ 414 пераростак вызначаюцца абвешчаны з дзіцячых дамоў і рэвэмпіркоўваюцца на працы па ўстановах і прадпрыемствах.

Апошнія спэктаклі для моладзі.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" сумесна з цэнтральным клюбам імя КІМ на ягодзе вырокнай ЦДТ арганізуе апошнія у гэтым сэзоне агульна-даступныя спэктаклі для рабочай служачай і вучнёўскай моладзі Менску.

Спэктаклі будуць наступныя:

У суботу 23-га красавіка—„Над Нёманам".
У серэду 4-га мая—„Каваль Ваявода".
У аўторак 10-га мая—Дыспут аб пастаноўках і концэрт.
У пятніцу 13-га мая—„Мешчанін у шляхцтве".

Білеты на спэктаклі прадаюцца ў рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" (Комсамольская 25), а на вечарох—у клюбе „КІМ".

Уваход на дыспут—дармовы па асобным білетам.

„Дружна! Раз-два"...

Першае лодачнае катаньне.

Ямчэ хмарна на вуліцах, ямчэ дуе халодны вецярок, сонца штохвіліна хаваецца пад хуткія белыя хмаркі, а моладзь ужо вячыкае скарыстоўваць вясеньнае багацьце.

17-га красавіка юнасьцюм дому Працясьветы паладзіла першае лодачнае катаньне.

Сабралося 22 чал. Спачатку крыху холадна. Але наступова лодачнікі „расшпрвяюцца" скідваюць кажухі, пальто...

Лодкі паволна сьлізгаюць па ціхай вадзе. Рытмічна падымаюцца і апускаюцца вёсы...

Плывём уверх па плыві.

Часта перакрыкваемся з побач плывучымі лодкамі...

На адной лодцы „Ластачка" бравычкі маладзіна...

Вось мінаваці мост, скураныя заводы...

Чыстуе, прасторнае паветра ўзьнімае ноўкою грудзьмі...

Запагнулі песеньку...

Уніз па матушцы,
Па Сьмеячы...

Між тым вечарэла... Павярнулі назад.

Уніз па рацэ лодка нясецца, як страла...

Набліжаемся да берагу. А хацелася-б катацца яшчэ і яшчэ...

Весела ідзем у горад.

Р. Гольдзін.

Аб усім.

Пяшчанае цуда аўтамабільнага караля.

Францыя нічым ня горш Амэрыкі: у яе таксама ёсьць свой уласны аўтамабільны король Сітроен. Праўда, ён ня так багаты, як Форд, і, мусібыць, не так вядом яшчэ, але за тое, ён ужо зрабіў такое, да чаго не дадумаўся нават Форд: ён ухітрыўся правесьці праз Сахару аўтамабільны шлях. Ён абсталяваў яго свайімі машынамі—аграмаднымі, добраабсталяванымі аўтабусамі. Праз пекальні дзесяткаў кілёмэтраў ён пабудаваў раскошныя станцыі, і з таго часу ўва ўсіх выключна багатых эўрапейцаў і амэрыканцаў існуе арыгінальнае модная правіла: пракаціцца па гэтай дарозе, выкінуць на гэта тысячу даляраў і мець правы расказаць, што ім удалося набываць у пятрах Сахары.

З усяго гэтага самае прыемнае, вядома, апавяданьне аб сваім такончыўшымся вандраваньні, седзячы у сябе ў комфортабельным асабняку, затым, што некаторыя на ўсе стараньні Сітроена, паездка па Сахары дае капрызных іньнежаных багацеяў досыць утаміцельная гісторыя: тут і жарэ, і пясок, і інш. нямрыемнасьці. Вось чаму на апошні час, ня гледзячы на моду, якая яшчэ ўвесь час прадаўжаецца, прыбытві ад «Сахарнай дарогі» Сітроена сталі катастрофічна падаць. Але аўтамабільны король не спалохаўся: каб адратаваць становішча, ён рашыў абставіць вандраваньне па Сахары так, каб самы прыдзірчывы пасажыр застаўся здаволеным.

На яго заданьне шмодкі інжынер Бінтаф скінуў проэкт гігантскага аўтамабіля з тымі паверхамі комфортабельных кают. У іх можа зьмясьціцца 300 пасажыраў, якія, пераязджаючы Сахару, не адчуваюць ні палячага сонца, ні едкага пяску—так востраумна пабудаваны гэты «пяшчаны карабель». Сітроен спадзяецца і ня без падставы, што цяпер прыбыткі яго зноў пачнуць «вагмальна» расьці: на сьвеце яшчэ многа багатых глупцоў, якія не пашкадуюць выкінуць адпаведную колькасьць даляраў за здавальненьне пракаціцца на гэтым волаце.

Чужаземныя часопісі кажуць, што ён ужо падрыхтоўвае пабудову свайго новага цуда.

Аб музычным тэхнікуме амаль ня ведаюць.

А работа вядзецца значная

Менскі Беларускі музычны тэхнікум параўнаньні і мінулымі гадамі мае значныя дасягненьні.

У гэтым годзе ў тэхнікуме маюцца наступныя клясы: класа скрыпкі, рояля, віолянчэль, контрабас, сольных сьпеваў, харавая класа, класа тэорыі композыцыі, хорэографічная (балет), духавая (труба, валтарна, фагот, кларнэт, габой, флейта і цугтрамбон).

Акрамі спэцыяльных маецца пазмешараг абавязковых прадметаў, як: тэорыя музыкі, сольфэджыо, роль, беларуская мова, грамадзяўства, гісторыя музыкі, ударныя інструманты, опэрны і струнны ансамбль, аркэстравая класа і гісторыя грыму. Закуплены новыя інструманты, ноты і шмат іншыя музычныя прылады.

У гэтым годзе процант наведваньня абавязковых прадметаў значна павялічыўся, асабліва, павялічыўся процант наведваньня лекцыяў на беларускай мове і грамадзяўству. Як дасягненьне, трэба адзначыць і тое, што ўжо некаторыя прадметы выкладаюцца выключна на беларускай мове.

У гэтым годзе пры тэхнікуме арганізавана комсамольская ячэйка, якая налічвае ў сваім складзе 25 асоб.

За кароткі пэрыод наша комсамольская ячэйка пры дапамозе партыйнай Рабісаўскай змагла акрэпнуць і падняць свой аўторытэт сярод беспартыйнага студэнцтва.

Комсамольская ячэйка змагла правільна кіраваць і працай профкому. У сучасны момант мы бачым значны ўзрост профэсыі Рабіс за лік рабочых і сялян.

Недахопам у жыцьці студэнтаў нашага тэхнікуму адзначаецца тое, што няма агульнага памяшканьня, сталоўкі і недастаткова колькасьць стыпэндый (усяго-66). Для паляпшэньня матэрыяльнага становішча па меры магчымасьці паладжваюцца платныя віно-сэансы і концэрты.

Як недахоп трэба адзначыць і тое, што пра музтэхнікум мала пішацца ў газэтах. Гэты факт адбіўся ў некаторай ступені на росьце тэхнікуму за лік рабочых і сялян.

Тэхнікум ставіць перад сабою задачу апролетарызаваць тэхнікум шляхам упушчэньня рабочай і сялянскай моладзі, стаць кузьняй дзе выкоўваюцца пралетарскі работнікі, мастацтва. Стварыць сваю нацыянальную музыку, прыстасоўваючы яе да пролетарскага слухача і г. д.

Б. Фрыдман.

Ліст у рэдакцыю.

Паважаны тав. рэдактар!

У № 35 (417) «Чырвонай Зьмены» быў зьмешчаны допіс «Слабы настаўнік—слабая праца», у якім піша у адстаўленьні курсантаў, асабліва комсамольцаў, па грамадзяўству ускладаецца на настаўніку па гэтаму прадмету.

Студком Менскіх 2-х гадовых настаўніцкіх курсаў ад імя ўсіх слухачоў

Пратэстуе супроць неправільнага зьместу допісу.

Прычынай адставаньні вынуждаецца не кажа выкладчыцца, а дрэнное становішча курсаў: адсутнасьць асабнага памяшканьня, інтэрнату слухачоў, недахоп падручнікаў, мізэрная праграма і слабая перыхтоўка слухачоў.

Студкам лічыць, што аўтар выдатна адзначанага допісу на моў нізвіх фактаў, якія сведчылі-б аб дрэнным праны настаўніцы.

Пры гэтым адзначаем, што настаўніцы на грамадзяўству заўсёды дапамагаюць працы, а таксама імкнецца даць слухачам увесь тое, што ці не залежыць.

Студкам Менскіх 2-х гадовых беларускіх настаўніцкіх курсаў.

Згублены:

Час. пасьведчаньне № 219 на імя С. Ф. Сінаў, выд. Слуцкім акругкомам ЛКСМБ.

Час. пасьведчаньне 71, выд. Слуцкім АК ЛКСМБ—Гурэму Барысу.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІН.

Галоўлітвед № 24867, Менск, 2 друкарня БДВ.